ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 12 (1238) ● 5 красавіка 1979 г. Цана 2 кап.

## НА СТАРЦЕ— «ЧЫРВОНАЯ СУБОТА»

Стала традыцыяй напярэдадні гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна праводзіць камуністычны суботнік.

29 сакавіка камітэт камсамола ўніверсітэта зацвердзіў састаў камсамольскага штаба і план-графік правядзення Ленінскага камуністычнага суботніка. Студэнты будуць працаваць на розных аб'ектах: на дарозе – эксплуатацыйным участку, у вучэбных карпусах і інтэрнатах універсітэта.

У састаў камсамольскага штаба па кіраўніцтву суботнікам увайшлі:

наменснік сакратара камітэта камсамола А. Калінка (старшыня штаба);

М. Прыгодзіч — член камітэта камсамола (намеснік старшыні);

Б. Атапін — член штаба;

А. Саўчанка — член штаба;

А. Шыбут — член штаба.

На гэтым пасяджэнні камітэт камсамола зацвердзіў спіс адказных за правядзенне ленінскага суботніка на факультэтах універсітэта:

А. Калінка — факультэт фізікі і радыёфізікі;

В. Левашэвіч — гістрычны, ФПМ;

М. Прыгодзіч — юрыдычны, журналістыкі, мехмат;

М. Няхайчык — хімфак;

Л. Воўчак — геафак;

А. Гаралёва — біялагічны, філалагічны.

***

30 сакавіка студэнты фізічнага факультэта працавалі на добраўпарадкаванні вуліц Маскоўскага раёна беларускай сталіцы. Яны першымі ва ўніверсітэце прынялі ўдзел у камуністычным суботніку.

Адказным за яго правядзенне камітэт камсамола фізфака назначыў Сяргея Філатава — камсорга трэцяга патока.

Добра працавалі Кацярына Апаровіч, Васіль Белы, Мікалай Кузьміч.

Наменснік сакратара камітэта камсамола фізфака Аляксандр Карэнка ацаніў працу студэнтаў на «добра».

С. СІНІЛАЎ.

## ПА БДУ

Міжвузаўская навукова-практычная канферэнцыя на тэму «Роля камсамольскіх арганізацый ВНУ ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у святле патрабаванняў XXV з'езда КПСС і XVIII з'езда ВЛКСМ» 28 сакавіка адбылася ва універсітэце. Яе арганізатарамі былі Маскоўскі РК ЛКСМБ і камітэт камсамола БДУ. На пленарным пасяджэнні з дакладамі выступілі сакратар Маскоўскага РК ЛКСМБ Г. Хухлындзін, намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта М. Няхайчык, малодшы навуковы супрацоўнік праблемнай лабараторыі сацыялагічных даследаванняў БДУ І. Андрэева, інструктар Мінскага абкома камсамола М. Машкароў. Усяго ж на чатырох секцыях было заслухана 29 дакладаў і паведамленняў, з якімі выступілі студэнты-актывісты медыцынскага, педагагічнага інстытутаў, універсітэта.

Адбылася зацікаўленая размова аб шляхах і метадах далейшага паляпшэння работы камсамольскіх арганізацый з выдатнікамі вучобы, іменнымі стыпендыятамі, студэнтамі першых курсаў.

Шмат увагі ўдзялялася таксама пытанням арганізацыі і правядзення сацыялістычнага спаборніцтва сярод акадэмічных груп, работы вучэбна-выхаваўчых камісій па павышэнню якасці ведаў студэнтаў.

Па выніках канферэнцыі выпрацаваны выдаць метадычныя рэкамендацыі і тэзісы выступленняў. Па прапанове ўдзельнікаў правядзенне такіх канферэнцый стане традыцыйным.

М. ПРЫГОДЗІЧ, намеснік сакратара камітэта камсамола.

●

На філалагічным факультэце стала добрай традыцыяй праводзіць сустрэчы з выпускнікамі. 30 сакавіка на сустрэчу са сваімі былымі выкладчыкамі і сённяшнімі студэнтамі прыйшлі выпускнікі філфака.

З прывітальным словам да сабраўшыхся звярнулася Зінаіда Бранiславаўна Вapаповіч. Яна расказала аб задачах, якія паставіў перад педагогамі XXV з'езд КПСС. Скнцэнтравала ўвагу на пытаннях марксісцка-ленінскай тэорыі, педагогікі, псіхалогіі, тэорыі і метадыкі выкладання прадметаў.

Сардэчна павіншавала маладых настаўнікаў, пажадала ім творчых поспехаў у працы і грамадскай дзейнасці.

Сустрэча прайшла цікава і плённа.

А. МАРЧУК.

## У аб'ектыве —фізфак



**Студэнт чацвёртага курса 9-й групы У. Яронскі сваю курсавую работу выконвае на кафедры фізікі цвёрдага цела.**

**Ідуць заняткі ў лабараторыі методыкі выкладання фізікі. Выкладчык С. І. Галко займаецца са студэнтамі IV курса 10-й групы.**

Фота **У. Крыловіча.**



## Ідзе агляд-конкурс

**Святочны, прыўзняты настрой пануе ў гэтыя дні ў Беларускім дзяржаўным універсітэце: 2 красавіка пачаўся традыцыйны агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці факультэтаў. Шматлінія ўдзельнікі і балельшчыкі запоўнілі актавую залу галоўнага корпуса. Перад сабраўшыміся выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце А. Я. Малышаў.**

**Агляд-конкурс адкрылі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці філалагічнага факультэта. Затым выступалі студэнты факультэта радыёфізікі і электронікі. У праграме другога дня агляду-конкурсу — канцэрт студэнтаў факультэта прыкладной матэматыкі. У сераду выступалі самадзейныя артысты гістарычнага і біялагічнага факультэтаў, сёння, у чацвер, вы зможаце паглядзець выступленне студэнтаў геаграфічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў. У пятніцу вас гасцінна запрашаюць на свой канцэрт студэнты хімічнага і фізічнага факультэтаў. Завершаць агляд-конкурс мінулагодніх пераможцы — студэнты факультэта журналістыкі і студэнты юрыдычнага факультэта.**

**9 красавіка ў 16 гадзін у актавай зале галоўнага корпуса пачнецца агляд мастацкай самадзейнасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. У ім прымуць удзел калектывы мастацкай самадзейнасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў філалагічнага, геаграфічнага, хімічнага, фізічнага і факультэта прыкладной матэматыкі, вылічальнага цэнтра, навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем.**

**Агляд будзе праходзіць два дні: 9 і 11 красавіка.**

**Усіх аматараў мастацкай самадзейнай творчасці чакаем у актавай зале.**

**Л. АНДРЭЕВА.**

# Сацыялістычныя абавязацельствы

## КАЛЕКТЫВУ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА НА 1979 ГОД

Калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна настойліва ажыццяўляе гістарычныя рашэнні XXV з'езда КПСС. Сацыялістычныя абавязацельствы, прынятыя ў гонар 60-годдзя Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і Камуністычнай партыі Беларусі, паспяхова выкананы. Новымі поспехамі ў вучэбнай і вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і грамадска-палітычнай рабоце азнаменаван трэці год дзесятай пяцігодкі.

Прафесарска-выкладчыцкі састаў, студэнты, аспіранты, рабочыя і служачыя універсітэта горача адабраюць рашэнні лістападаўскага (1978 г.) Пленума ЦК КПСС, палажэнні і вывады, выкладзеныя ў выступленні на Пленуме Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР тав. Л. І. Брэжнева, прымаюць іх да няўхільнага кіраўніцтва і выканання і прымаюць на 1979 год — чацвёрты год дзесятай пяцігодкі наступныя сацыялістычныя абавязацельствы:

1. Выканаць устаноўлены на 1979 год дзяржаўны план падрыхтоўкі спецыялістаў па ўсіх формах навучання.

2. Шляхам удасканалення ўсіх форм вучэбнай, вучэбна-метадычнай работы павысіць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй. З гэтай мэтай:

— пастаянна весці работу па ўдасканаленню спецыяльнай падрыхтоўкі студэнтаў, абнаўленню спецкурсаў і спецсемінараў з улікам навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі; распрацаваць 153 новыя курсы, спецкурсы, спецсемінары, лабараторныя работы;

— выдаць і падрыхтаваць да выдання 280 вучэбна-метадычных дапаможнікаў і распрацовак; падрыхтаваць і заслухаць на кафедрах 370 навукова-метадычных дакладаў; забяспечыць тэхналагічнымі картамі ўсе вывучаемыя ў ВНУ дысцыпліны;

— эфектыўней выкарыстоўваць у вучэбнай і выхаваўчай рабоце тэхнічныя сродкі і наглядныя дапаможнікі, для чаго падрыхтаваць 125 серый дыяпазітываў, 20 дыяфільмаў, 1350 слайдаў, 84 наглядныя дапаможнікі, 750 гербарных лістоў;

— стварыць навукова-метадычны савет па этыцы Мінвуза БССР на базе ІПК;

— удасканальваць формы і метады вучэбнай работы, практыкаваць шырокі абмен вопытам арганізацыі вучэбнай і самастойнай работы студэнтаў, уліку бягучай паспяховасці, для чаго правесці агульнаўніверсітэцкую навукова-метадычную канферэнцыю па праблемах універсітэцкай адукацыі, міжкафедральныя і кафедральныя навукова-метадычныя семінары, факультэцкія канферэнцыі па выніках практыкі;

— правесці шырокую работу па прафарыентацыі сярод выпускнікоў школ рэспублікі з мэтай прыцягнення абітурыентаў да паступлення ва універсітэт і забеспячэння належнага конкурсу па ўсіх спецыяльнасцях; прачытаць для настаўнікаў і вучняў школ рэспублікі 500 лекцый, правесці рэспубліканскія алімпіяды па фізіцы і хіміі, арганізаваць заняткі ў «Школе юных» з вучнямі школ г. Мінска і падшэфных школ Мінскай вобласці.

3. Забяспечыць выкананне на высокім тэарэтычным узроўні запланаваных заданняў у галіне навуковых даследаванняў усімі НДІ, кафедрамі, лабараторыямі, супрацоўнікамі і выкладчыкамі да 20 снежня 1979 года. У святле пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 6 красавіка 1978 г. «Аб павышэнні эфектыўнасці навукова-даследчай работы ў вышэйшых навучальных установах» звярнуць асобую ўвагу на развіццё фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў, паскараць іх укараненне ў народную гаспадарку, пастаянна ўдасканальваць формы сувязі навукі з прамысловасцю.

У галіне навукова-даследчай работы:

— давесці ў 1979 годзе колькасць тэм, выконваемых па пастановах Савета Міністраў СССР і БССР, праграмах работ па рашэнню навукова-тэхнічных праблем і асобных пастановах Дзяржкамітэта па навуцы і тэхніцы, каардынацыйных планах АН СССР і АН БССР, заказах галіновых міністэрстваў, ведамстваў па дзяржбюджэту да 53 працэнтаў ад агульнай колькасці тэм навуковых даследаванняў, па гасдагаворах — да 38 працэнтаў; якасна і эфектыўна выканаць усе заказы прамысловых прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў;

— выканаць устаноўлены план па дасягненню пацверджанага вытворчасцю эканамічнага эфекту ад укаранення вынікаў завершаных навуковых работ на 101,5 працэнта;

— выдаць 25 манаграфій, 25 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, 10 брашур, 15 зборнікаў навуковых прац, 1269 артыкулаў;

— аформіць і прадставіць у Дзяржаўны камітэт па справах вынаходніцтваў і адкрыццяў 180 заявак на мяркуемыя вынаходніцтвы і адкрыцці; прадставіць на ВДНГ СССР і ВДНГ БССР 3 экспанаты; на медыка-біялагічныя выпрабаванні прадставіць 30 уноў сінтэзаваных прэпаратаў; у фармакалагічны Камітэт Міністэрства аховы здароўя СССР — матэрыялы па таксіка-фармакалагічных даследаваннях для атрымання дазволу на клінічныя даследаванні па 2-х прэпаратах супрацьгіпаксічнага дзеяння;

— падрыхтаваць і правесці 15 навукова-тэарэтычных канферэнцый, сімпозіумаў і семінараў; на міжнародныя, усесаюзныя і рэспубліканскія навуковыя канферэнцыі і семінары падрыхтаваць 370 дакладаў;

— павысіць эфектыўнасць выкарыстання ЭВМ у вучэбнай і навукова-даследчай рабоце, для чаго расшырыць магчымасці мультыпраграмнага рэжыму работы ЭВМ, палепшыць якасць падрыхтоўкі машынных насіцеляў інфармацыі, забяспечыць сярэднегадавы каэфіцыент карыснай работы ЭВМ «Мінск-32» — 0,92, «ЕС-1022» — 0,88; укараніць падсістэму «Кантроль выканання дакументаў», распрацаваць і правесці вопытную эксплуатацыю падсістэмы «Улік матэрыяльных каштоўнасцей»;

— ахапіць навукова-даследчай работай 76 працэнтаў студэнтаў дзённай формы навучання; прадставіць на рэспубліканскі і ўсесаюзны агляды-конкурсы 670 студэнцкіх навуковых работ; пад-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

# Сацыялістычныя абавязацельствы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

рыхтаваць на студэнцкія навуковыя канферэнцыі 600 дакладаў;

— правесці на факультэтах і патоках 50 навукова-метадычных студэнцкіх канферэнцый па грамадскіх навуках;

— арганізаваць і забяспечыць работу 60 студэнцкіх навуковых гурткоў;

— давесці колькасць рэкамендаваных ДЭК да ўкаранення і да друку дыпломных работ да 16 працэнтаў;

— у сааўтарстве з выкладчыкамі надрукаваць не менш як 70 навуковых работ студэнтаў.

4. Пастаянна павышаць кваліфікацыю навуковых і навукова-выкладчыцкіх кадраў праз аспірантуру, інстытуты і факультэты павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў, шляхам удасканалення атэстацыі і конкурснага адбору палепшыць іх якасны састаў. З гэтай мэтай:

— падрыхтаваць і абараніць 5 доктарскіх дысертацый;

— шляхам конкурснага адбору забяспечыць выкананне дзяржаўнага плана прыёму ў аспірантуру па ўсіх спецыяльнасцях за лік асоб, найбольш падрыхтаваных у тэарэтычных адносінах, праявіўшых сябе ў навукова-даследчай рабоце і здольных да педагагічнай дзейнасці; дабіцца, каб не менш як 55 працэнтаў аспірантаў закончылі аспірантуру, абараніўшы дысертацыю ці прадставіўшы яе да абароны; аспірантам, спаборнікам на атрыманне і супрацоўнікам абараніць 29 і прадставіць да абароны 49 кандыдацкіх дысертацый;

— павялічыць колькасць навуковых і навукова-педагагічных работнікаў з вучонымі ступенямі і званнямі на адзін працэнт, ахапіць усімі формамі павышэння кваліфікацыі не менш як 20 працэнтаў выкладчыкаў;

— удасканальваць работу ІПК і ФПК пры Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна; для работы са слухачамі прыцягваць вядучых спецыялістаў г. Мінска ў галіне грамадскіх і фізіка-матэматычных навук, а таксама запрашаць вядомых спецыялістаў з Масквы, Ленінграда, Кіева і іншых гарадоў; забяспечыць якаснае выкананне ўстаноўленага плана прыёму і выпуску слухачоў ІПК і ФПК.

5. Пастаянна ўдасканальваць работу па камуністычнаму выхаванню студэнтаў і ўсяго калектыву:

— забяспечыць выкананне комплекснага плана ідэйна-выхаваўчай работы са студэнтамі на ўвесь час навучання ва універсітэце;

— удасканальваць метады і формы грамадска-палітычнай атэстацыі студэнтаў;

— удасканальваць стыль і метады работы школы маладога лектара і факультэта грамадскіх прафесій; давесці колькасць слухачоў школы маладога лектара да 300, а слухачоў факультэта грамадскіх прафесій — да 690 чалавек;

— рэгулярна і на высокім узроўні весці работу ў падшэфных домакіраўніцтвах, школах, ГПТВ г. Мінска, калгасах і саўгасах Дзяржынскага, Стаўбцоўскага, Нясвіжскага і Клецкага раёнаў; арганізаваць 30 выездаў лекцыйна-агітацыйных брыгад і калектываў мастацкай самадзейнасці ў падшэфныя арганізацыі; накіраваць 15 педатрадаў студэнтаў для работы ў піянерскіх пакоях пры домакіраўніцтвах; давесці агульную колькасць студэнтаў, прымаючых удзел у лекцыйна-прапагандысцкай, агітацыйна-масавай рабоце да 5000;

— усяму калектыву універсітэта актыўна прапагандаваць вялікую спадчыну класікаў марксізму-ленінізму, рашэнні XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ, матэрыялы ліпеньскага (1978 г.) і лістападаўскага (1978 г.) Пленумаў ЦК КПСС, палажэнняў і вывадаў, вынікаючых з выступленняў на Пленумах Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР тав. Л. І. Брэжнева; сіламі калектыву прачытаць для насельніцтва рэспублікі 6000 лекцый і дакладаў на грамадска-палітычныя і навуковыя тэмы;

— сфарміраваць зводны студэнцкі будаўнічы атрад агульнай колькасцю 2320 чалавек для працы ў летні час і тры колькасцю 60 чалавек для працы ў зімовы час; асвоіць сіламі студэнцкіх будаўнічых атрадаў не менш як 5,5 млн. рублёў капітальных укладанняў.

6. Усім гасразліковым прадпрыемствам датэрмінова выканаць гадавыя планы: выдавецтву і друкарні БДУ — да 28 снежня; спецыяльнаму канструктарскаму бюро з ВВ — да 27 снежня; вучэбна-вопытнай гаспадарцы «Шчамысліца» выканаць прамысловы план да 1 снежня 1979 г. і ад рэалізацыі прадукцыі атрымаць прыбытак 68,5 тыс. рублёў.

7. Па аддзелу капітальнага будаўніцтва:

— план капітальных укладанняў выканаць да 28 снежня, а гадавы план выканаць на 100,5 працэнта;

— увесці ў эксплуатацыю вучэбна-лабараторны корпус прыродазнаўчых факультэтаў у Шчамысліцы, план уводу асноўных фондаў выканаць на 100,2 працэнта;

— план па капітальнаму і сярэдняму рамонту выканаць да 20 снежня 1979 года.

8. Забяспечыць высокую працоўную і вучэбную дысцыпліну на ўсіх факультэтах і ў падраздзяленнях універсітэта; весці пастаянную работу па стварэнню здаровага мікраклімату ва ўсіх калектывах, высокай прынцыповасці і патрабавальнасці, дабівацца зніжэння выпадкаў парушэння працоўнай дысцыпліны, правілаў сацыялістычнага супольнага жыцця.

9. Сістэматычна весці работу па паляпшэнню ўмоў працы і тэхнікі бяспекі; асвоіць 15 тыс. рублёў на мерапрыемствы па далейшаму ўдасканаленню ўмоў працы.

10. Дабівацца беражлівых адносін да дзяржаўнай маёмасці, эканамічнага расходавання сродкаў і матэрыялаў; дабіцца ў 1979 годзе эканоміі:

— электраэнергіі — 20 тыс. квт/гадзін;

— вады — 12 тыс. $м^3$;

— бензіну — 2 тыс. літраў;

— будматэрыялаў — на суму 20 тыс. рублёў.

Павялічыць прабег аўтамашын без капітальнага рамонту на 10 працэнтаў.

11. Павысіць узровень спартыўнай і аздараўленчай работы ў перадалімпійскім годзе;

— правесці агульнауніверсітэцкую студэнцкую спартакіяду па 26 відах спорту і спартакіяду «Здароўе» па 13 відах спорту;

— падрыхтаваць 6 майстроў спорту, 91 кандыдата ў майстры спорту і спартсменаў першага разраду, 4300 спартсменаў масавых разрадаў, 1100 грамадскіх інструктараў па фізкультуры і спорту, 1100 суддзяў па розных відах спорту;

— падрыхтаваць 2540 значкістаў ГПА;

— поўнасцю выкарыстаць спартыўныя базы, аздараўленчы лагер для масавага прыцягнення да рэгулярных заняткаў спортам;

— ахапіць адпачынкам у летнім спартыўна-аздараўленчым лагеры «Нарач» да 750 студэнтаў і 100 сем'яў супрацоўнікаў універсітэта;

— стварыць першую эксперыментальную аўтаматычную праграму навучання фізічным практыкаванням.

12. З мэтай самага шырокага прыцягнення ўсіх студэнтаў, супрацоўнікаў і прафесарска-выкладчыцкага саставу да работы па паляпшэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй, павышэння эфектыўнасці навуковых даследаванняў, высокай арганізацыі ідэйна-выхаваўчай работы правесці ў 1979 годзе:

а) агульнауніверсітэцкія агляды-конкурсы:

— на лепшую студэнцкую акадэмічную групу;

— на лепшую кафедру і навукова-даследчае падраздзяленне па культуры вытворчасці і ахове працы;

— на лепшую пастаноўку работы ў студэнцкім інтэрнаце;

б) агляды мастацкай самадзейнасці, насценнага друку, нагляднай агітацыі.

Сацыялістычныя абавязацельствы абмеркаваны і прыняты на сходах кафедр, лабараторый, факультэтаў і іншых падраздзяленняў.

# Фотаінфармацыя



На журфаку адбылася сустрэча з нямецкім студэнтам Ральфам Пехштэдтам па праграме інтэрвыхавання. Госць расказаў прысутным аб сістэме навучання ў ГДР, падрыхтоўцы да святкавання 30-й гадавіны ўтварэння сацыялістычнай нямецкай дзяржавы, адказаў на пытанні.

Фота У. Носава.



Нядаўна ў актавай зале інтэрната № 7 адбыўся вечар салідарнасці са змагаючымся В'етнамам, падрыхтаваны нямецкімі студэнтамі. Перад аўдыторыяй выступіў в'етнамскі аспірант То Туан.

Прагучалі песні пратэсту, якія выканалі групы в'етнамскіх і нямецкіх студэнтаў.

Вось што гаворыць аб вечары нямецкі студэнт Йенс Герлах:

— Асноўная мэта нашага вечара — узняць дух салідарнасці. Мы напісалі дзве рэзалюцыі, пад якімі кожны паставіў свой подпіс.

Фота У. Носава.

# Маршрутамі прафарыентацыі

У Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна дыяпазон прафарыентацыі, пастаяннай работы са школьнай і працоўнай моладдзю вельмі шырокі. Факультэты і кафедры штогод праводзяць алімпіяды сярод школьнікаў, на якіх выяўляюцца юныя таленты і схільнасць моладзі да той ці іншай галіны навукі. Трывала ўвайшло ў практыку факультэта журналістыкі, геафака і іншых адкрыццё і сістэматычная дзейнасць своеасаблівых прафесіянальных школ, напрыклад, школы юных карэспандэнтаў, географаў, праграмістаў і г. д. Гасцінна запрашаюць выкладчыкі і студэнты будучых абітурыентаў на свае факультэты ў так званыя «Дні адкрытых дзвярэй», у час якіх моладзь знаёміцца з навучальнай установай, з сістэмай вучобы і будучай спецыяльнасцю.

Гэта добрыя, эфектыўныя формы прафарыентацыі, але ёсць тут адна асаблівасць, якая некалькі звужае дыяпазон работы, абмяжоўвае маладзёжную аўдыторыю. Справа ў тым, што гэтыя формы арыентацыі разлічаны на тое, каб юнакі і дзяўчаты самі прыходзілі на знаёмства. Але не кожнаму гэта ўдаецца і з-за аддаленасці, і з-за занятасці. Вось гэта і выклікала да жыцця такую форму работы, як выезды агітбрыгад з ліку студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта ў розныя куткі рэспублікі.

...Раніцой 12 сакавіка з універсітэцкага гарадка адправіўся аўтобус. Яго пасажыры — больш як 50 выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Маршрут паездкі быў загадзя дэталёва вызначан і нанесен на карту рэспублікі. Блакітная стрэлка ад Мінска прайшла па розных раёнах Гомельскай, Брэсцкай, Гродзенскай, Віцебскай і часткова Мінскай вобласці. Характэрнай асаблівасцю гэтага маршрута з'яўляецца тое, што пралёг ён у асноўным па ўскраінах рэспублікі, у найбольш аддаленых ад Мінска раёнах.

Перад удзельнікамі паездкі была пастаўлена ясная і грунтоўная мэта — пабываць у глыбінных раёнах, у сельскіх школах, калгасах, на прадпрыемствах, сустрэцца з моладдзю і дэталёва пагутарыць аб перспектывах вучобы ва універсітэце, расказаць аб буйнейшай ВНУ рэспублікі, даць кансультацыі і парады, унесці свой уклад у афармленне школьных кабінетаў прафарыентацыі. Для кожнага ўдзельніка паездкі вызначаны свой маршрут, свая зона і раёны.

Аўтобус вырваўся з гарадскіх кварталаў і ўзяў кірунак на Гомельшчыну. Першы прыпынак — Мазыр. Тут зона работы агітацыйнага дэсанта ў саставе шасці выкладчыкаў розных факультэтаў пад кіраўніцтвам В. П. Сярэбранікава. Сярэднія школы, гаспадаркі і прадпрыемствы Мазырскага, Хойніцкага, Брагінскага і Петрыкаўскага раёнаў наведалі прадстаўнікі нашага універсітэта, больш сарака выступленняў перад школьнай і працоўнай моладдзю зрабілі яны за пяць дзён.

З Мазыра аўтобус накіроўваецца ў Пінск. Тут таксама застаецца прадстаўнічы дэсант, зонай ахопу якога становяцца школы, гаспадаркі і прадпрыемствы Жыткавіцкага, Столінскага, Пінскага, Лунінецкага, Ганцавіцкага і Іванаўскага раёнаў. А агітбрыгада адпраўляецца далей на захад. Драгічын, Кобрын, Маларыта, Жабінка, Бяроза, Белазёрск, Івацэвічы — у гэтых пунктах выступалі з лекцыямі прадстаўнікі БДУ. У школьных кабінетах прафарыентацыі, на дошках аб'яў прадпрыемстваў паявіліся буклеты і аб'явы аб прыёме студэнтаў на новы навучальны год.

У Гродзенскай вобласці члены агітбрыгады актыўна разгарнулі сваю работу ў сярэдніх школах Дзятлава і Навагрудка, Слонімскага, Ваўкавыскага і Зельвенскага раёнаў. Тут асаблівую зацікаўленасць моладзь выказвала да ўмоў навучання на філалагічным, гістарычным і іншых факультэтах. У Гальшанскай, Жупранскай сельскіх і гарадскіх сярэдніх школах Ашмянскага раёна склалася традыцыйная арыентацыя лепшых вучняў на матэматычныя, фізічны і гістарычны факультэты БДУ. З гэтых школ і цяпер шмат моладзі займаецца ва універсітэце, а выпускнікі БДУ працуюць у школах.

Вялікую дапамогу ў прафарыентацыйнай рабоце агітбрыгадзе аказалі камсамольскія актывісты, работнікі Ашмянскага і Астравецкага раёнаў. Дзякуючы ім на семінарах сакратароў пярвічных камсамольскіх арганізацый прагучаў падрабязны расказ аб Беларускім дзяржаўным універсітэце, а ўмовы прыёму студэнтаў і аб'явы, можна сказаць, трапілі амаль у кожную школу, гаспадарку і на прадпрыемства. Добрай трыбунай для прапаганды нашага універсітэта сталі старонкі газет як у Ашмянскім, так і ў іншых раёнах.

Плённа папрацавалі члены агітбрыгады ў Віцебскім і Лёзненскім раёнах, у школах і гаспадарках Мядзельскага раёна на Міншчыне.

І вось паездка закончана, падводзяцца яе вынікі, абмяркоўваюцца тыя плюсы і мінусы, якія выявіліся ў час работы. А на карце рэспублікі ўжо праляглі новыя маршруты — у новым саставе агітбрыгады выязджаюць у аддаленыя раёны Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей.

Жыццё паказвае, што такая форма прафарыентацыйнай работы, як агітбрыгады выкладчыкаў і студэнтаў, мае свае дадатныя якасці. Яна дазваляе расшырыць дыяпазон уплыву універсітэта на моладзь рэспублікі, расшырае граніцы маладзёжнай аўдыторыі і, нарэшце, дае магчымасць непасрэднага кантакту выкладчыкаў БДУ са школьнікамі, з будучымі студэнтамі.

**В. ЖАРЫКАЎ,**
**удзельнік агітпаходу.**



*Хочаце, верце, хочаце, не, але іменна 1 красавіка 1970 года нарадзіўся ФПМ. І тады ж паявілася традыцыя адзначаць дні факультэта. Вясенняй калаверцю праімчаліся яны і на гэты раз.*

*ДЗЕНЬ ПЕРШЫ. Факультэцкія аўдыторыі напоўніліся галасамі будучых абітурыентаў. На ФПМ — дзень адкрытых дзвярэй. Потым на шахматна-шашачным турніры зноў, як і ў час сесіі, сустрэліся студэнты з выкладчыкамі. Праўда, дыялог праходзіў моўчкі. А вось на матэматычным баі скрыжавалі шпагі лепшыя матэматыкі факультэта. Увечары ў Мінскім Доме настаўніка студэнтаў чакала агітбрыгада Ленінградскага політэхнічнага інстытута. І новая праграма вакальна-інструментальнага ансамбля ФПМ.*

*ДЗЕНЬ ДРУГІ. «У спартыўнай зале універсітэта сустракаюцца чэмпіёны ФПМ, толькі ў розных камандах», — паведаміла афіша. Валейбол, баскетбол, міні-футбол уваходзілі ў першакрасавіцкі турнір.*

*ДЗЕНЬ ТРЭЦІ. Самы адказны для выкладчыкаў. У час прэс-канферэнцыі яны павінны адказаць на любыя пытанні студэнтаў. Многія выкладчыкі шчыра прызнаваліся, што ім дрэнна спалася напярэдадні, а іх жонкі, праводзячы на канферэнцыю, жадалі «ні пуху, ні пер'я».*

*У камітэце камсамола таксама прэс-канферэнцыя. Ідзе абмен вопытам камсамольскай работы з гасцямі факультэта.*

*ДЗЕНЬ ЧАЦВЁРТЫ. Урачысты вечар. Факультэт віншуюць госці з Гомеля, Гродна, Вільнюса, Казані, Ленінграда, Варонежа, Томска, Кіева, Ерэвана. Новую праграму прапаноўвае тэатр мініяцюр. Першакурснікаў пасвячаюць у студэнты.*

*ДЗЕНЬ ПЯТЫ — дзень навукі. На навуковай канферэнцыі студэнты расказалі аб сваіх даследаваннях і дасягненнях. З дакладамі выступілі госці факультэта.*

*У дзевяты раз адшумела факультэцкае свята. Раз'ехаліся госці, развіталіся з цяперашнімі гаспадарамі былыя выпускнікі ФПМ. І сёння факультэт расказвае аб сваіх працоўных буднях.*

**Н. РЫЖКЕВІЧ.**

ФАКУЛЬТЭТ прыкладной матэматыкі Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна быў створан 1 красавіка 1970 года на базе некалькіх кафедр матэматычнага факультэта.

Назва факультэта ўжо сама гаворыць аб накіраванасці і прамак матэматыкі развіваўся з моманту яе зараджэння. Узнікненне ў апошнія гады навуковых праблем і цэлых навуковых напрамкаў абумоўлена развіццём і шырокім прымяненнем ЭВМ у розных галінах народнай гаспадаркі, навукі і тэхнікі, якія прывялі да расшырэння сэнсу паняцця «прыкладная матэматыка» і развіццё якіх немагчыма ўявіць без ЭВМ. Ад матэматыка-прыкладніка патрабуецца вельмі шмат: ён павінен ясна ўяўляць сутнасць даследуемай прыкладной задачы, умець падбіраць і распрацоўваць матэматычны апарат, які лепш за ўсё адлюстроўвае прыроду з'яў, складаць матэматычную мадэль даследуемага працэсу, распрацоўваць і ствараць алгарытм рашэння задачы і даводзіць яго да ліку.

# Адпаведна з запытаннямі практыкі

...тызаваных сістэм кіравання, прымяненню сродкаў вылічальнай тэхнікі да рашэння прыкладных задач. Агульная падрыхтоўка і спецыялізацыя студэнтаў ажыццяўляецца 8 кафедрамі факультэта, на якіх працуе больш чым 100 выкладчыкаў. Сярод іх такія вядомыя матэматыкі, як акадэмік АН БССР У. І. Крылоў, член-карэспандэнт АН БССР Я. А. Іваноў, дактары фізіка-матэматычных навук прафесары Ю. С. Багданаў, Р. Ф. Габасаў, Г. А. Мядзведзеў і іншыя. Да выкладчыцкай работы на факультэце прыцягваюцца многія спецыялісты народнай гаспадаркі, супрацоўнікі АН БССР, якія маюць вялікі вопыт работы ў галіне прымянення сродкаў вылічальнай тэхнікі, матэматычнага забеспячэння сучасных ЭВМ і АСК. Выпускнікі факультэта накіроўваюцца на работу ў ВЦ, навукова-даследчыя ўстановы, канструктарскія бюро, вышэйшыя навуковыя і іншыя ўстановы, дзейнасць якіх звязана з выкарыстаннем ЭВМ.

спецыфіцы падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі. Мы сустракаемся з матэматыкамі двух розных напрамкаў — тэарэтыкамі, якія даследуюць матэматычныя заканамернасці ў рамках самой матэматыкі, і прыкладнікамі, інтарэсы якіх вызначаюцца ў першую чаргу запытаннямі практыкі, магчымасцямі і перспектывай прымянення матэматыкі ў нематэматычных па свайму зместу галінах навукі, тэхнікі і народнай гаспадаркі. Наогул, цяжка правесці грань паміж гэтымі двума напрамкамі і вызначыць, дзе заканчваецца чыстая матэматыка і пачынаецца прыкладная і наадварот.

Паняцце прыкладной матэматыкі часам звязваюць толькі з электроннымі вылічальнымі машынамі (ЭВМ), хоць гэта далёка і не так. Прыкладны на-

У цяперашні час на факультэце займаецца каля 1400 студэнтаў. З першага дня стварэння і па сённяшні дзень кіруе факультэтам член-карэспандэнт АН БССР прафесар Я. А. Іваноў. На факультэце праводзіцца спецыялізацыя па трох напрамках: матэматычнаму забеспячэнню ЭВМ, матэматычнаму забеспячэнню аўтама-

**В. КАРЗЮК,**
**намеснік дэкана факультэта прыкладной матэматыкі, дацэнт.**

# НАША ПРАЦОЎНАЯ СЛАВА

Першыя СБА факультэта паявіліся 9 гадоў назад, у год яго нараджэння. Тады было сфарміравана 10 атрадаў агульнай колькасцю 250 чалавек. Цяжка параўноўваць нашы сённяшнія атрады з тымі першымі, якія пачыналі адлік выдатных спраў камсамольцаў факультэта. Змянілася якасць падрыхтоўкі камандзіраў, камісараў і ў цэлым усіх байцоў, расшырылася геаграфія работы, інтарэсы будатрадаўцаў сталі больш шматграннымі, але засталіся былы камсамольскі запал, прага творчасці, імкненне заўсёды і ва ўсім быць наперадзе.

Сучасны СБА складаны, як і любы калектыў індывідуумаў. Але кожны ў ім павінен да канца ўсведамляць пастаўленую перад атрадам мэту, свята верыць у сяброўства, ва ўсім і заўсёды абапірацца на плячо сябра — у гэтым сутнасць зладжанага калектыву, якому не страшны ніякія цяжкасці.

У гэтым годзе школу СБА пройдуць больш за 340 юнакоў і дзяўчат, аб'яднаных у 10 атрадаў. На факультэце займаецца большасць дзяўчат. Усяму універсітэту вядомы нашы лепшыя жаночыя атрады, але з фарміраваннем мужчынскіх атрадаў у нас існуюць пэўныя цяжкасці. Сказваецца і адсутнасць належнай нагляднай агітацыі, якая заклікана як мага шырэй прапагандаваць СБА. Былі ўлічаны гэтыя заўвагі з боку штаба працоўных спраў БДУ, і зараз на факультэце рыхтуюцца матэрыялы для афармлення стэнда па гісторыі СБА ФПМ. Ёсць у нас і праблемы з падборам камандзіраў і камісараў. Як правіла, на факультэт паступаюць учарашнія выпускнікі школ, у якіх няма вопыту работы на прадпрыемствах і да якіх гэты вопыт прыходзіць не за адно будатрадаўскае лета.

На працягу падрыхтоўчага перыяду нашы СБА аднолькава ўдзяляюць увагу і выступленню з канцэртамі, і чытанню лекцый, і працоўным дэсантам, і шэфскай рабоце. Можа некаторую перавагу мае шэфская работа, бо сярод байцоў шмат членаў педатрада факультэта, у якіх ёсць немалы вопыт работы з падлеткамі. Сярод лепшых атрадаў факультэта патрэбна адзначыць СБА «Іскра», «Карчагінец», «Сузор'е».

Зараз, калі наш факультэт адзначае свой дзень нараджэння, нельга не ўспомніць лепшых байцоў, ветэранаў СБА: А. Новікава, В. Абразцова, П. Якаўлева, В. Гаруса, Л. Марудаву, С. Казайчэнка, Ю. Марчанкава і многіх іншых.

**У. ШУЛЬГАН.**

# Калектыў аднадумцаў

Фенікс у міфалогіі — казачная птушка, якая ў старасці спальвае сябе і зноў нараджаецца з попелу маладой і абноўленай, — сімвал вечнай неўміручасці.

На ФПМ пад гэтай назвай добра ведаюць агітбрыгаду факультэта. Пачатак ёй паклаў першы канцэрт у Стаўбцоўскім раёне невялікай групы рабят на чале з Анатолем Новікавым, тады студэнтам, а зараз малодшым навуковым супрацоўнікам. Паказчык дзейнасці агітбрыгады — яе выступленні. На сённяшні дзень іх налічваецца 157.

9 гадоў існуе агітбрыгада. Мяняліся кіраўнікі, мяняўся і састаў. Зараз у нас працуе, можна сказаць, трэцяе пакаленне. Кожны ўдзельнік — гэта своеасаблівы універсал: ён і танцор, і спявак, і чытальнік, і акцёр. Так-так, акцёр, бо кожнае выступленне — гэта невялікая інсцэніроўка нашага жыцця. Перад студэнтамі, напрыклад, мы выступалі з праграмай «Пагаворым аб дзіўнасцях кахання», перад школьнікамі — «Дык станем жа студэнтамі»; «Паляванне на галачак» закранае сельскія тэмы.

«Фенікс» ведаюць многія мінчане: навучэнцы тэхнічнага вучылішча № 76 радыёэлектронікі, студэнты МРТІ і БСГА. А раз у год, на зімовых канікулах — гэта ўжо традыцыя — мы выязджаем з канцэртнай праграмай у адзін з раёнаў Мінскай вобласці. Цёпла сустракалі нас працаўнікі Вілейскага, Мядзельскага, Любанскага, Салігорскага, Слуцкага раёнаў.

Агітбрыгада — калектыў аднадумцаў. Рабяты любяць сваю справу, для іх яна — частка жыцця. Нашы ветэраны Света Дарошка, Лёня Кашкурэвіч, Міша Модэль удастоены звання ганаровага члена агітбрыгады. Кожны з іх удзельнічаў больш чым у 50 канцэртах. Задор, баявітасць, гумар заўсёды з імі. У той жа час да кожнага канцэрта рабяты адносяцца сур'ёзна, удумліва, з поўнай аддачай сіл.

Жанр агітбрыгадаўскага мастацтва наогул даволі складаны. Дастаткова сказаць, што кожнае кароценькае 30—40-хвіліннае выступленне каштуе месяца—двух упартых шуканняў і працы. І дзякуючы ім «Фенікс» зноў і зноў выходзіць на сцэну маладым і абноўленым.

**У. СЕЧКА,**
**кіраўнік агітбрыгады.**



# Ці лёгка плаціць за смятану?

600 секунд раскатистого смеха,
Считают просвещенные умы,
Сметаны литр заменят вам
с успехом.
Что ж, смейтесь! За сметану
платим мы.

Гэтымі словамі пачынаўся адзін з першых спектакляў тэатра мініяцюр ФПМ.

Адкрыць занавес — справа нехітрая. Намнога складаней сабрацца з духам, выйсці на сцэну і прымусіць смяяцца на працягу некалькіх гадзін вялікую студэнцкую аўдыторыю. Смяяцца і думаць.

Тэатр мініяцюр ФПМ існуе пяць гадоў. Зараз ужо немагчыма ўявіць красавіцкія дні факультэта без першакрасавіцкага вечара з абавязковым выступленнем ТМ. Колькасць жадаючых паглядзець прадстаўленне заўсёды значна большая за колькасць месц у арэндуемых залах, хоць звычайна гэта залы буйнейшых у горадзе палацаў культуры. Заўсёды — аншлаг, заўсёды ТМ чакаюць з нецярпеннем. Вядомасць прыйшла да тэатра амаль адразу (рэдкі выпадак) пасля першых выступленняў. ТМ ведаюць на іншых факультэтах БДУ. Штогод вясной ён — жаданы госць у Кіеўскім і Ленінградскім універсітэтах. У біяграфіі тэатра — удзел у праграме Беларускага тэлебачання, прысвечанай нашаму універсітэту.

Пяць гадоў — гэта шмат. Закончылі вучобу ва універсітэце арганізатары тэатра, на старэйшых курсах займаюцца былыя навічкі. Але не змянілася галоўнае — адданасць тэатру яго ўдзельнікаў. Нязменна і тое, што ўсе праграмы ад пачатку і да канца ствараюцца самімі студэнтамі.

Тэатр пасталеў — зараз на сцэне побач са студэнтамі можна ўбачыць яго ветэранаў: выкладчыка, інжынера, аспіранта. «Пасталелі» і праграмы тэатра — яны ўжо не з'яўляюцца чыста студэнцкімі, а закранаюць больш шырокі круг праблем.

Уважліва адносяцца стваральнікі ТМ да музыкі і песні, якія мякка адцяняюць безутрымную весялосць адных мініяцюр, дапамагаюць глыбей адчуць лірызм другіх, падкрэсліваюць думку трэціх. Смяшыць гледача — далёка не галоўная задача, хаця і гэта не так проста: бо пошласць і безгустоўнасць — ворагі тэатра. ТМ часта ставіць мэту прапанаваць гледачу паглядзець на сябе збоку, задумацца. І гумар у гэтым — вельмі каштоўны памочнік.

Здаецца, шмат яшчэ можна было б расказаць аб тэатры мініяцюр ФПМ і яго праграмах, але лепшае ўяўленне аб ім, вядома, можна скласці, толькі пабываўшы на яго выступленні. Прыходзьце — не пашкадуеце.

**І. ШМУРАТКА.**

## НА КОНКУРС

ЁСЦЬ на гістарычным факультэце калектыў мастацкай самадзейнасці, які заваяваў шырокую папулярнасць не толькі ва універсітэце, а і далёка за межамі горада Мінска. Гэта — квартэт дзяўчат, якім кіруе студэнтка-завочніца II курса Соф'я Шамаль. Яна імкнецца кожную вольную хвіліну выкарыстаць для творчых гутарак і рэпетыцый, згуртоўвае дзяўчат і дае ім неабходныя навыкі ў галіне песеннага мастацтва. Увесь вольны час Соф'я цалкам аддае любімай справе, прычым зусім бескарысліва.

# ДЗЕЛЯ ЛЮБІМАЙ СПРАВЫ

Для таго, каб больш давядацца аб калектыве, лепш пазнаёміцца з яго ўдзельнікамі, я наведаў інтэрнат № 1, дзе яны пражываюць. Але дома аказалася толькі адна прадстаўніца квартэта, Алена Сівалобава. Колькі энергіі і дабрадушнасці ў гэтай дзяўчыны! Мне проста пашанцавала, што з выпадкова сустрэўся з ёй, бо сёння Алена таксама збіралася на рэпетыцыю. Наогул, дзяўчаты ў апошнія дні былі настолькі заняты, што ў інтэрнацкія пакоі вярталіся апоўначы, перад самым закрыццем уваходных дзвярэй. І гэта ніколькі не адбівалася на іх занятках, бо кожная з іх вучыцца толькі на добра і выдатна.

— Калі ўжо ёсць такая магчымасць, то мне хочацца сказаць вялікае дзякуй у адрас кіраўніка нашага квартэта, якая нам дапамагае добрым веданнем народнай песні. А ў нашым жа рэпертуары фальклор займае важнае месца, — гаворыць Алена.

Калектыў штогод выконвае песні на агульнауніверсітэцкіх аглядах-конкурсах мастацкай самадзейнасці, часта выступае за універсітэт на абласных аглядах. Дзяўчаты былі неаднаразовымі лаўрэатамі абласнога агляду-конкурсу, выязджалі з канцэртамі ў горад Дзяржынск і г. п. Узду, выступалі перад студэнтамі РТІ, БДУ і іншых навучальных устаноў. Колькі б разоў ні прапанавалі выступіць, куды б ні накіроўвалі, яны ніколі не адмаўляліся. Першае месца ва універсітэце — такі вынік іх напружанай працы.

Хто яны, гэтыя няўрымслівыя паклоннікі песні? Акрамя Алены Сівалобавай, студэнткі III курса аддзялення гісторыі, якая адначасова з'яўляецца байцом СБА імя акадэміка Нікольскага, актыўнай удзельніцай мастацкай самадзейнасці атрада, у квартэт уваходзяць трэцякурсніцы аддзяленняў гісторыі і філасофіі Ірына Міхайлава і Ірына Піўчанка. Дзяўчаты ўжо тры гады займаюцца ў квартэце, Наташа Кузьміч, студэнтка другога курса аддзялення філасофіі — яшчэ толькі два гады.

Рэпетыцыі для іх з'яўляюцца не простым выкананнем песень. Спачатку песні выконваюцца па партыях або асобнымі выканаўцамі, а потым кожны ўдзельнік уносіць свае прапановы, якія абавязкова ўлічваюцца пры выпрацоўцы агульнай думкі наконт таго, як выконваць адну песню і як другую.

Дзеля любімай справы дзяўчаты не лічацца са сваім уласным часам. Гэта прыводзіць да маналітнасці, аднадушнасці, узаемаразумення, што у сваю чаргу з'яўляецца добрым спадарожнікам поспеху. Лепшымі песнямі ў выкананні квартэта лічацца «Беларусь», «Цішыня», «Ой рана на Івана», «Чабарок», а сярод тых, якія прагучаць упершыню ў выкананні квартэта ў бліжэйшы час, — «Бабуленька», «Мой родны кут», «Песня пра камара» і іншыя.

Любяць сваіх спявачак і на факультэце, і ў інтэрнаце. Аднакурснік М. Калядка ацаніў работу квартэта такімі словамі: «Цудоўна працуюць». І гэта сапраўды так, бо за кожным паспяховым выступленнем — праца, праца, праца. Колькі намаганняў трэба прыкласці, каб давесці гучанне песні да прафесійнага ўзроўню, — ім вядома вельмі добра.

Зайшла ў нас размова і аб узнагародах. Што ж, атрымлівалі грашовыя прэміі, атрымлівалі звесткі аб лідэрстве. Ды ўсё гэта далёка не тое, што патрэбна калектыву самадзейнасці сёння. Прыгожае выкананне песні — гэта адзін бок справы. Іншая справа абстаіць з касцюмамі. Тры гады выступаюць дзяўчаты на сцэне, але апрануты хто ў што. Трэба сказаць, што праблема гэта існуе ўжо даўно. І папярэднікі Соф'і Шамаль у свой час мелі такую ж праблему. Вось тут бы пэўным арганізацыям, звязаным з фінансавым забеспячэннем, і аказаць патрэбную дапамогу, але так ужо павялося, што калі пра гэта заходзіць размова, то ніхто не хоча слухаць і ўсе закрываюць вочы, а на просьбы адказваюць маўчаннем або абяцаннем. І яшчэ адно пажаданне... Дзяўчаты згодны ехаць з канцэртнай праграмай у любы горад і раён рэспублікі разам з калектывамі іншых факультэтаў універсітэта, але тут уся справа ўпіраецца ў камандзіровачныя. Калі будзе пераадолен гэты бар'ер — невядома. У гэтым семестры рэпертуар квартэта значна папоўніўся новымі песнямі, якія практычна склалі яго аснову. З новай праграмай квартэт упершыню выступіў 4 сакавіка перад выбаршчыкамі аднаго з выбарчых участкаў сталіцы, а таксама перад студэнтамі радыёфізічнага факультэта.

Развітваючыся з Ленай, я пажадаў ёй і яе сяброўкам новых удалых выступленняў перад шырокай публікай. Адказ прагучаў коратка і ясна:

— Пастараемся.

І дзяўчаты стараюцца.

**А. ХАЛЕЦКІ.**
**(Прэс-цэнтр прафкома БДУ).**

## НАШЫ ВЫДАТНІКІ

# ДАБРАТА

— Шчасце патрэбна, але якое? Ёсць шчасце—выпадак, гэта не для мяне. Хацелася б, каб яно прыйшло як заслуга.

І яно прыйшло да Сашы. У чым жа яно, Сашына шчасце? Ва ўпэўненасці ў сабе, у свае сілы, здольнасці. Яго шчасце ў тым, што ён патрэбен людзям і яны патрэбны яму. Вось у чым яно, сапраўднае, чалавечае шчасце. І няхай не заўсёды лёгка яно даецца, прыходзіць праз цяжкасці, праз барацьбу з сабой, галоўнае — умець перадольваць іх.

Цяпер А. Грыцанаў на чацвёртым курсе гістарычнага факультэта. Ён выдатнік вучобы, член студэнцкага навуковага таварыства.

Мне давялося пабываць на некалькіх пасяджэннях гуртка, на якіх Аляксандр рабіў даклады. Выступаў упэўнена, натхнёна. Яснасць думкі, прастата і даступнасць паведамлення, вобразнасць — вось што характарызуе Сашу як дакладчыка. Кожнае яго выступленне — своеасаблівая, арыгінальная форма падачы матэрыялу. Памятаю, як пасля чарговага выступлення Сашы перад першакурснікамі выкладчыца гісторыі КПСС Галіна Іванаўна Ільяшчук сказала:

— Калі б усе студэнты былі такія, як Грыцанаў, выкладчыкам было б вельмі цікава працаваць. А наогул Саша проста малайчына. Ён ніколі не адмаўляецца ад грамадскіх даручэнняў і бліскуча спраўляецца з любым з іх.

Таму, здаецца, зусім не выпадкова яго прызначылі кіраўніком студэнцкага гуртка па гісторыі КПСС. Саша з натхненнем узяўся за даручаную справу. Вучыць іншых, многаму вучыцца і сам.

Я аднойчы спытала ў Сашы, ці баяўся ён чаго-небудзь у жыцці? І Саша адказаў:

— Не! Галоўнае — верыць у людзей і каб яны верылі табе. І поспех прыйдзе, няхай не адразу, але прыйдзе.

У Сашы шмат сяброў: яны часта збіраюцца разам, абмяркоўваюць розныя пытанні сучаснасці, прапаноўваюць, даказваюць, спрачаюцца.

Я звярнулася да яго сяброў з пытаннем, што больш за ўсё цэняць яны ў характары Сашы?

Ірына Левіна:

— Галоўнае ў Сашы —дабрата. Любіць гумар. Шчыры з сябрамі. Умее цаніць дружбу.

Наталля Мізяк:

— Ясны розум і чалавечая дабрата. Бадай, гэтае надзвычай рэдкае спалучэнне якасцей мне падабаецца ў Сашы больш за ўсё. Ён ніколі не ставіць сябе вышэй за іншых. Я памятаю яго з першага курса. Удумлівы. Перш чым прыняць якое-небудзь рашэнне, старанна абдумае яго.

Анатоль Рэзнік:

— Больш за ўсё дабрата. Я не памятаю, каб ён у чым-небудзь адмовіў мне. Аляксандр упэўнен у дасягненні сваёй мэты, а наогул — ён шчыры, сумленны таварыш.

Ігар Велічанскі:

— Саша — мой самы лепшы сябар. Хачу адзначыць яго вялікую працавітасць. Тое, што я, напрыклад, раблю за тры гадзіны, Саша — за гадзіну. Але ўжо працуе з поўнай аддачай сіл. Мы часта спрачаемся з ім па розных пытаннях жыцця. І як правіла, думка Сашы амаль ніколі не бывае памылковай. Ён не любіць педантызму, увесь час у пошуку.

Я размаўляла з сябрамі Сашы ў розных абставінах. Усе яны розныя па характару, светапогляду. Але і Ігар, і Наташа, і Анатоль, і Ірына вызначылі дабрату як самую лепшую рысу яго характару. Магчыма, гэта і дапамагае Сашу ў вучобе, навуковай рабоце, адносінах паміж сябрамі.

— Саша — гэта талент, — скажуць аднакурснікі. Так, талент. Памятаеце, у А. М. Горкага:

— Талент — гэта вера ў сябе, у свае асабістыя сілы.

І Саша верыць, верыць і старанна рыхтуе сябе да будучага. Займаецца навуковай работай, распрацоўвае розныя праблемы, якія датычаць капіталістычных краін Захаду. Задум і планаў шмат. Верыцца, што ўсё тое, аб чым сёння марыць Саша, стане заўтра рэчаіснасцю. Будзе яшчэ шмат шчаслівых зорак на яго шляху. А пакуль А. Грыцанаў у няспынным пошуку, у пошуку тых неад'емных атрыбутаў, якія стануць крытэрыямі яго жыцця.

**Л. ЖЫЛІНСКАЯ.**



**У нядзелю футбалісты зборнай БДУ ў зале універсітэта правялі таварыскую сустрэчу па міні-футболу са стаўбцоўскай камандай «Нёман». Вядома, што каманда «Нёман» у гэтым годзе дэбютуе ў першынстве рэспублікі па футболу.**

**Нягледзячы на некалькі аслаблены састаў, студэнты атрымалі ўпэўненую перамогу з лікам 12:6. Лепшымі ў нашай камандзе былі Сяргей Гняўко і Юрый Фефелаў, якія забілі па чатыры галы.**

**Гэта сустрэча ўваходзіць у праграму падрыхтоўкі зборнай універсітэта да новага сезона.**

**А. ДАБРЫЯН,**
**слухач падрыхтоўчага аддзялення.**

# СПОРТ СПОРТ СПОРТ

Нядаўна пачалася V спартакіяда замежных студэнтаў г. Мінска, якая праводзіцца аддзелам замежных студэнтаў пры Мінгарвыканкоме. Аднымі з першых праходзілі спаборніцтвы па лыжах, якія праводзіліся ў Дражні. Месцы размеркаваліся наступным чынам:

I месца — інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі;
II месца — ТВ № 31;
III месца — Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна;
IV месца — БПІ;
V месца — індустрыяльна-педагагічны тэхнікум.

17—18 сакавіка ў спартыўнай зоне універсітэта праводзіліся спаборніцтвы па валейболу. Іх канчатковыя вынікі:

I месца — БПІ;
II месца — ТВ № 31;
III месца — БДУ імя У. І. Леніна;
IV месца — тэхнікум сувязі.

З 22 па 27 сакавіка ў барацьбу ўступілі баскетбалісты. Першае месца ў спаборніцтве занялі БПІ, другое—БДУ імя У. І. Леніна, трэцяе — архітэктурна-будаўнічы тэхнікум, чацвёртае —МДПІ імя А. М. Горкага, пятае — індустрыяльна-педагагічны тэхнікум.

Хутка пачнуцца спаборніцтвы па стральбе, якія таксама ўваходзяць у праграму спартакіяды.

**А. ЯФІМАЎ,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**



**На здымку:** у час спаборніцтваў.

## «Займальная» арыфметыка

Тыя, хто ў адзін з сакавіцкіх вечароў спяшаўся ў актавую залу галоўнага корпуса на канцэрт ансамбля «Верасы», не ведалі, што ў якасці бясплатнага прылажэння да песеннай праграмы іх будзе прапанавана займальная арыфметычная задача. А сутнасць яе вось у чым. Стаіць рад крэслаў. На першы погляд, рад, як рад. Але толькі на першы. Бо з аднаго боку ён пранумараван лічбай 25, а з другога — 26 (ці адпаведна 26 і 27: такіх радоў было некалькі). Вось і атрымалася, што на некаторыя месцы аказалася адразу па два прэтэндэнты. Апераруючы сваімі арыфметычнымі падлікамі, кожны з іх павінен быў даказаць, што мае законнае права на спрэчнае крэсла. Той, хто прайграваў, займаў стаячае месца. Арыфметычныя «дуэлі» настолькі захапілі, што многім іх удзельнікам было ўжо не да канцэрта (суседзям таксама)...

У мяне ёсць прапанова для наступнага мерапрыемства: нумар месца ў білеце трэба зашыфраваць у выглядзе біквадратнага ўраўнення. А ну, паламайце галаву!

**Л. ДРАЗДОВА,**
**студэнтка журфака.**

**Рэдактар А. ДЗЕРАШ.**

НАШ АДРАС **220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.**